# У НЦСМ адкрылася Другое трыенале маладых мастакоў

01.11.2022 09:33

У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў 20 кастрычніка адкрылася Другое трыенале маладых мастакоў. Фінальны этап Рэспубліканскага конкурсу, які ладзіцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, скіраваны на падтрымку і прэзентацыю таленавітай моладзі: мастакоў, куратараў, студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў галіне культуры.



Падчас адкрыцця.

У 2022 годзе ўдзел у трыенале ўзялі больш за 50 аўтараў да 35 гадоў. Журы ацэньвала ў 8 намінацыях: «Жывапіс», «Графіка», «Скульптура», «Манументальнае і манументальна-дэкаратыўнае мастацтва», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Мастацкая дынастыя», «Фатаграфія», «Навацыя». Наведвальнікі маюць магчымасць прагаласаваць у межах намінацыі «Сімпатыя гледачоў».

Падтрымка і распаўсюджванне мастацтва — справа вельмі важная, а тым больш датычна маладых аўтараў. У сучасным матэрыяльным свеце вельмі істотна нагадваць пра духоўныя каштоўнасці, якія аб’ядноўваюць.

Адкрыў выстаўку дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, вядомы беларускі мастак і куратар Сяргей Крыштаповіч:



Дырэктар НЦСМ Сяргей Крыштаповіч.

— Я хачу падзякаваць кожнаму аўтару, работа якога ўпрыгожыла наша трыенале. Зычу кожнаму з вас стаць пераможцам, паколькі, на мой погляд, усе работы вартыя адзнакі і ўвагі. Я магу назваць кожны твор і адзначыць яго асаблівасці, унікальнасць. Заставайцеся маладымі. Прымайце ўдзел у кожным конкурсе, пакуль піша рука і стварае сэрца. Я вельмі рады, што мы зрабілі другі крок, другое трыенале. У нашых маладых мастакоў свой погляд на свет. Беларусь мае добрую мастацкую школу. І я ў гэтым пераканаўся чарговы раз падчас пленэру, прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Якуба Коласа і Янкі Купалы, які адбыўся ў ліпені гэтага года. Як многа ў гэтых карцінах чалавечага! Такое акадэмічнае вяртанне да чалавека для мяне — вялікае адкрыццё і радасць. Выхадцы з Беларусі сфарміравалі XX стагоддзе, будзе добра, калі і XXI сфарміруюць нашы суайчыннікі.

Выступіў перад удзельнікамі і Глеб Отчык, старшыня Беларускага саюза мастакоў:

— Сапраўды, конкурс быў вельмі вялікі. Тры гады таму мы зладзілі Першае трыенале маладых мастакоў з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. Тады пляцоўкай для правядзення выстаўкі стаў Палац мастацтва. Мне не забыць той уздым, натхненне, атмасферу, што панавалі ў зале. А зараз я бачу, наколькі за тры гады падзея стала больш сур'ёзнай і прафесійнай. Сустрэў тут не пачаткоўцаў, а сталых творцаў, якім ёсць што сказаць гэтаму свету. Упэўнены, выстаўку такога ўзроўню можна паказваць і за межамі нашай краіны, прэзентаваць на любых міжнародных пляцоўках і ганарыцца тым, што гэта зрабілі беларусы. Аднойчы ў Італіі да мяне звярнуўся адзін вядомы прафесар фларэнтыйскай акадэміі мастацтваў і сказаў, што ў нашай краіны вялікая будучыня, бо ў нас вельмі таленавітая моладзь. Сёння я магу смела сказаць, што ў нас таленавіты народ.

Як адзначыў Сяргей Крыштаповіч, адбылося пэўнае акадэмічнае вяртанне. Мастакі больш сталыя, змагаючыся з рэалістычным савецкім афіцыёзам, у кантэксце якога існавалі, часам былі вельмі неакадэмічныя.

Намагаліся рабіць супрацьлеглае і выяўляць людзей такімі, што і пазнаць чалавечыя рысы цяжка. Другое трыенале паказала, што сёння маладыя творцы, наадварот, звяртаюцца да вобраза чалавека не трансфармуючы яго. Выявы на выстаўцы хутчэй падкрэслівалі вывучэнне і даследаванне вобраза душы праз сапраўдны выгляд, праз постаць і фактуру чалавека, спланаванае пазбяганне скажэння.
Новае пакаленне мастакоў нязмушана імкнецца адлюстроўваць чалавека чыстага, прыгожага, светлага і набліжанага да самой прыроды. Прастата — мастацкі грунт.
Як ніколі актуальныя словы доктара Снаўта з фільма «Салярыс» (1972 г, рэжысёр А. Таркоўскі): «Чалавеку патрэбны чалавек». Свядома ці падсвядома людзі прыходзяць да думкі, што цяпер, калі свет перажывае вялікую трансфармацыю, надышоў момант чалавека павярнуцца да чалавека. Паглядзець на сябе.



Святлана Сізянкова «Стварэнне», 2020 г.
Засталіся і традыцыйныя незменныя тэмы, якія працягваюць даследаваць сучасныя мастакі.
Так, мастачка Святлана Сізянкова прадставіла на трыенале сваю карціну «Стварэнне», напісаную ў 2020 годзе. На фоне калейдаскапічных рознакаляровых кавалкаў шкла і матэрыялаў размешчаны дзве рукі. Належаць гэтыя рукі могуць як мастачцы, якая стварае з хаосу свае карціны, так і Богу, які стварае з хаосу сусвет.
***Міфалагічны габелен «Гаспадар» аўтарства Анастасіі Падлознай, выпускніцы БДУКМ, адлюстроўвае міфалагічны код беларусаў. Уладар лесу, які і сам зліваецца са сваім царствам, спяшаецца абараняць звяроў, чапляючы даўжэзнай барадой дрэвы і ствараючы буру навокал. Містычныя зялёныя колеры на няроўнай фактуры, зробленай на ткацкім станку, адлюстроўваюць светабудову чалавечай душы. Для мастачкі гэтая работа стала самай доўгай за кар'еру. «Гаспадар» ствараўся 9 месяцаў.***
Наведвальнікаў таксама чакаюць лекцыі, сустрэчы, прэзентацыі, майстар-класы і іншыя мерапрыемствы.
Другое трыенале маладых мастакоў працягнецца да 20 лістапада. Яна ЦЭГЛА